**Браслаўскае музейнае аб'яднанне**
**Браслаўскае краязнаўчае таварыства імя О.Хедэмана**

# КРЫЖАВАНКІ

**Зборнік падрыхтаваны сябрамі дзіцячага краязнаўчага клуба "Спадарожнікі часу" пад кіраўніцтвам Таццяны Бальс**

Браслаў 1999

Браслаўскае музейнае аб'яднанне
Браслаўскае краязнаўчае таварыства ім. О.Хедэмана

# КРЫЖАВАНКІ

Зборнік падрыхтаваны сябрамі дзіцячага
краязнаўчага клуба "Спадарожнікі часу"
пад кіраўніцтвам Таццяны Бальс

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/22 sprava 1/285

Браслаў 1999

Укладанне і прадмова:Таццяна Бальс

Кампутарны набор:Таццяна Бальс
Аляксандр Панцялейка

Мастацкія працы:Святлана Бялова

Адрас:
211970 Браслаў, вул.Энгельса 39, тэл. 21445
E-mail: bkt@bsmus.lingvo.vitebsk.by

© Браслаўскае краязнаўчае таварыства імя О.Хедэмана. 1999 г.
© Браслаўскае музейнае аб'яднанне. 1999 г.
Наклад 50 паасобнікаў

# УСТУП

Кожны настаўнік у нашы дні мае магчымасць праявіць сябе як асоба творчая і таленавітая. Далёка па-за межамі школы застаюцца занятки-каноны, што робяць нецікавым навучанне для большасці школьнікаў. І менавіта настаўнік мае магчымасць адчыніць дзецям вялікую колькасць шляхоў для засваення ведаў, прапанаваць ім больш цікавыя працы і заданні.

Ідэя стварэння гэтага зборніка ўзнікла пасля аднаго з паседжанняў сяброў дзіцячага клуба "Спадарожнікі часу" пры Браслаўскім музейным аб'яднанні. Калі падышоў час развітвацца, дзеці выказалі жаданне прадоўжыць занятак. Атрымалася так, што сціплая крыжаванка, прапанаваная дзецям, зрабіла звычайны занятак больш цікавым. Паступова гэтым пачалі займацца і на паседжаннях разам з дзецьмі. А прапанова скласці крыжаванку ў якасці дамашняга задання іх вельмі зацікавіла. Пачалі з'яўляцца і самастойныя працы.

У зборніку сабраны ўзоры розных крыжаванак. Карыстацца гэтым невялічкім выданнем можна не толькі ў школьным класе. Прапанаваныя крыжаванкі могуць стаць прыкладам для стварэння новых цікавых прац. Для дзіцяці зборнік будзе добрым сябрам і адначасова настаўнікам у вольную часіну. А правільныя адказы дапамогуць знайсці падказкі ў выглядзе літар і малюнкаў.

Крыжаванкі размешчаны аўтарам ад простых да больш складаных. У зборніку змешчаны і працы сяброў клуба "Спадарожнікі часу", вучняў сярэдняй школы №1 г.Браслава.

Адказы надрукаваны на апошніх старонках, але зазірнуць туды не спяшайцеся.

А зараз некалькі цікавых звестак з гісторыі ўзнікнення крыжаванкі.

Па словах Івана Шпадарука, "крыжаванка як гульня вядома з антычных часоў. Так пры раскопках рымскага паселішча Карыніўм у 1863 годзе на адной з пліт (знаходка датавана III – IV стст. н. э.) была знойдзена выява падобная на крыжаванку. У 1936 годзе такую ж крыжаванку знайшлі высечанай на калоне ў Пампеях. Але стваральнікам першай сучаснай крыжаванкі быў журналіст А.Уін, які эмігрыраваў у "Нью-Йорк геральд" 21 снежня 1913 года. Само ж слова паходзіць ад ангельскага "крас – ворд" – "крыж + слова". Гэта задача-гульня, у якой фігуру з перакрыжаванымі радкамі клетак трэба запоўніць адзіна магчымымі словамі".[1]

А вось В.А.Жаўнерчык сцвярджае, што "самую першую крыжаванку склаў жыхар Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Віктар Орвіл у турэмнай

[1] Шпадарук І. У свеце слоў, з'яў і фактаў. Мн., 1995. С. 30-31.

камеры. Орвіл быў прыгавораны да трох гадоў пазбаўлення волі за аўтамабільную катастрофу. Пакутуючы ў турме ад бяздзеяння, ён звярнуў увагу на брукаваную каменнымі плітамі падлогу, якая ўяўляла сабой бышцам правільную сетку з клетак. Орвіл пачаў маляваць на кавалачках паперы фігуры, складзеныя з квадратаў і паспрабаваў запоўніць клеткі фігур літарамі так, каб пры чытанні злева направа ў радках атрымаліся адны словы, а пры чытанні зверху ўніз другія. Цэлымі днямі Орвіл прыдумляў розныя камбінацыі ўзаемнаперакрыжаваных слоў. Сваё вынаходніцтва ён назваў гульнёй "Туды – сюды па квадраціках" і самую паспяховую з задач адаслаў у рэдакцыю мясцовай газеты. Гульня В.Орвіла мела ашаламляльны поспех. Да моманту вяртання аўтара гульні са зняволення ў адным з банкаў на яго імя ўжо меўся рахунак на буйную суму, а гульня абляцела ўвесь свет, атрымаўшы новую назву "крыжаванка".

Цікава, што на сёняшні дзень самай вялікай у свеце галаваломкай лічыцца крыжаванка складзеная французамі Гі Бруцці і Жанам Луізам. Яна дасягае пяці метраў у вышыню і трох – у шырыню. Каб рашыць яе, трэба ў 50 тысяч клетак упісаць 18 тысяч слоў."[1]

[1] Жавнерчик В.Э. Знаете ли вы свой край: кросворды, чайнворды, головоломки, ребусы, криптограммы. Мн., 1986. С. 5-6.



**№1**

## УСТАЎ ПРАПУШЧАНЫЯ ЛІТАРЫ

**…алькклор, з…рка, со...ца,**

**мя…зведзь, к…лядаванне, бу…ел,**

**...ата, мех…ноша, дрэ...а, з…ма,**

**калядоў…чык, ...ас, б…тлейка**

Выпішы па парадку літары,
якія ты ўставіў, і даведаешся,
як называецца памяшканне,
дзе захоўваюцца музейныя прадметы.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

## №2

## ПЕРАКЛАДЗІ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

1. Хозяйка. 2. Обряд. 3. Потолок. 4. Красный угол. 5. Оберег. 6. Домовой. 7 .Икона. 8. Крестины.

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Г | | | | | | | | |
| А | | | | | | | | |
| С | | | | | | | | |
| П | | | | | | | | |
| А | | | | | | | | |
| Д | | | | | | | | |
| А | | | | | | | | |
| Р | | | | | | | | |



## №3

## РАЗГАДАЙ КРЫЖАВАНКУ




1. Навука, якая вывучае мінулае. 2. Умацаванае жыллё. 3. “Брасл” у перакладзе з сучаснай латышскай мовы. 4. Доўгі, высокі земляны насып вакол замка. 5. Імя гераіні легенды аб заснаванні Браслава. 6. Легендарны князь, бацька Дрывы. 7. Жаночае ўпрыгажэнне. 8. Гліняны выраб. 9. Полацкі князь, заснавальнік Браслава. 10. Кніга з запісам гістарычных падзей у старажытныя часы.

## №4

# ЗНАЙДЗІ СЯРОД ЛІТАР НАЗВЫ ДЭТАЛЯЎ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СТРОЯ І АБВЯДЗІ ІХ

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| А | Н | Д | А | Р | А | К | А | П | Т | У | Р | С |
| Ш | А | Й | М | А | Р | А | С | О | Г | Х | О | К |
| Т | М | І | Н | Б | О | М | Ш | Я | Ж | У | Т | І |
| О | І | Л | Я | А | М | І | П | С | Н | С | Г | Н |
| Р | Т | О | М | К | Л | З | М | К | Л | Т | П | Д |
| Ф | К | У | С | А | Ы | Э | Ю | Ш | Ч | К | О | А |
| Ч | А | П | Е | Ц | Я | Л | З | А | П | А | Р | Ч |
| П | О | Р | Т | К | І | Ь | Ш | Ф | Д | Н | Ж | К |
| А | Н | В | Я | Н | О | К | А | Ш | У | Л | Я | А |
| Р | О | Б | І | Х | А | Р | А | Н | А | І | С | Т |
| Ц | К | А | Ў | П | А | К | П | О | В | Е | С | А |
| Ч | І | П | С | Ы | Ь | А | Ф | А | Р | Т | У | Х |
| Ш | К | А | Ж | У | Х | Р | Ш | Ы | Р | М | А | Н |



## №5

# РАЗГАДАЙ КРЫЖАВАНКУ




**Па гарызанталі:** 2. Усім цёпла – яму сцюдзёна, усім сцюдзёна – яму цёпла. 4. Без кліноў, без капылоў, само падыходзіць, ніхто яго не трывожыць.5 .Шуфлем есць, лапатай ходзіць.7. Баран стаіць, воўна дрыжыць.

**Па вертыкалі:** 1. Канёк-гарбунок усю хату аб'ездзіў. 2. Семсот варот – адзін уваход. 3. Без матора гудзіць, без пілота ляціць, не аса, а джаліць. 6. Чырвоны колер, вінны смак, каменнае сэрца.

## №6

## РАЗГАДАЙ КРЫЖАВАНКУ




**Па гарызанталі:** 1. Возера, уздоўж паўночнага берага якога цягнецца незвычайнай формы града, што нагадвае хрыбет фантастычнай жывелы. 2. Возера, назва якога пайшла ад балцкай асновы “бледны”, “слабы”. 3. Возера, якое ў старажытных балтаў азначала “навадзіць сон”, на возеры налічваецца 11 астравоў. 4. Самае вялікае на Браслаўшчыне і пятае па велічыні ў Беларусі возера. Паходжанне назвы звязваюць з балцкім словам, што азначае “рыхлы”, “топкі”.

**Па вертыкалі:** 1. Возера, паходжанне назвы якога звязваюць са славянскім “неспіш”, бадзерасць. 5. Возера, праз якое праходзіць мяжа паміж Беларуссю і Літвой. 6. Возера, на якім размешчаны другі па велічыні востраў на Беларусі – Чайчын. 7. Возера паміж Беларусю і Літвой, другое па глыбіні на Беларусі. 8. Рака, што выцякае з в.Дрывяты, злучае гэта возера з найвялікшымі азерамі і Заходняй Дзвіной.



## №7

## РАЗГАДАЙ КРЫЖАВАНКУ




**Па вертыкалі:** 1. Вёска размешчана на беразе аднайменнага возера. Назва паходзіць ад слова “плёс”. 2. Мястэчка, якое існавала на беразе возера Богінскае. Паходжанне назвы звязваюць з узгорыстай мясцовасцю. 4. Вёска размашчана на паўднёва-ўсходнім беразе возера Дрысвяты. Назва вёскі паходзіць ад назвы возера. 6. Гарадскі пасёлак размешчаны на беразе Заходняй Дзвіны пры ўпазденні ў яе ракі Друйкі. 7. Вёска, што размешчана на беразе возера Рака. 8. Вёска, назва якой паходзіць ад старажытнага славянскага прозвішча Богін. 9. Паводле легенды назва гэтай вёскі звязана з магілай любімага пса мясцовага пана.

**Па гарызанталі:** 3. Так называліся паселішчы, жыхары якіх маглі часова вызваляцца ад пэўных павіннасцей. 5. Горад, паходжанне назвы якога звязваюць з імем полацкага князя Брачыслава Ізяслававіча. 7. Вёска, якая размешчаецца паміж азёрамі Ільмёнак і Вера. Былы маёнтак. 8. Былая вёска на беразе возера Дрывяты, у 1976 годзе далучана да вёскі Ахрэмаўцы. Да 1939 года – маёнтак, які атрымаў назву ад французскага слова, што ў перакладзе азначае “прыгожая гара”. 10. Гарадскі пасёлак. Паданне тлумачыць паходжанне назвы ад слова “відзець”. 11. Вёска размешчана ў стоку рэк Дрысвяціца і Дзісна. Верагодней за ўсё назва паходзіць ад прозвішча, якое ўтварылася ад імя Кас’ян.

## №8




На пераплеценых стужках напісаны імёны асветнікаў і грамадскіх дзеячоў Беларусі. 7 па вертыкалі і 7 па гарызанталі. Стужкі пераплецены такім чынам, што частка літар закрыта. Паспрабуй знайсці ўсе імёны.



## №9

# РАЗГАДАЙ КРЫЖАВАНКУ




**Па гарызанталі:** 2. Пануючы стыль пры ўзвядзенні каталіцкіх святыняў у 2-ой пал. XIX – пач. XX ст. на Браслаўшчыне. 4. Вёска, у якой у 1901-1903 гг. узведзены касцёл Сэрца Ізуса. 7. Выдатны твор пейзажнай архітэктуры палацава-паркавы ансамбль на беразе возера Дрывяты. 9. Вядомыя магнаты, якія ў 1611 г. былі ўладальнікамі Друі.

**Па вертыкалі:** 1. Вядомы грамадскі дзеяч, адзін з герояў Грундвальскай бітвы 1410 г., які пэўны час быў намеснікам браслаўскім і фундаваў пабудову ў Браславе праваслаўнай царквы. 3. Вёска, у якой у пач. XX ст. пабудаваны мураваны касцёл Святога Яна Хрысціцеля. 5. Край, які называюць азёрным 6. Найвышэйшая кропка Браслаўскага ўзвышша на перашыйку паміж азёрамі Снуды і Струста. 8. Гарадзішча перыяду Полацкага княства на беразе возера Неспіш. 10. Вёска, у якой узведзены касцёл Божага цела.

## №10

# РАЗГАДАЙ КРЫЖАВАНКУ




1. Дачка Івана ІІІ, жонка Аляксандра Ягелончыка, атрымала Браслаў з наваколлем у падарунак ад мужа. 2. Таленавіты ўрач. Працаваў на Браслаўшчыне каля 40 год. 3. Намеснік і дзяржаўца браслаўскі ў 1502 – 1527 гг. 4. Кіраўнік паўстання 1794 г., паходзіў з беларускай шляхты. 5. Імя князя, з якім традыцыйна звязваюць паходжанне назвы Браслава. 6. Вядомы гісторык, аўтар «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» ў якой згадваюцца замкі Браслаўшчыны. 7. Вялікі князь літоўскі, кароль польскі, у 1500 г., падчас наведвання Браслава, надаў гораду Магдэбургскае права (няпоўнае). 8. Вялікі князь літоўскі. Пабываў у Браславе ў 1432 і 1435 гг. 9. Педагог, краязнаўца, гісторык. Аўтар кнігі «Гісторыя Браслаўскага павета», якую можна лічыць найбольш змястоўнай і каштоўнай працай па гісторыі Браслаўшчыны. 10. Скульптар, ураджэнец Браслаўскага павета, удзельнік паўстанняў 1831, 1863/64 гг. 11. Вядомы беларускі гісторык, археолаг, які праводзіў у 1989 г. даследванні на браслаўскай Замкавай Гары. 12. Адзін з кіраўнікоў паўстання 1794 г. пераемнік Т.Касцюшкі. 13. Настаўнік гісторыі. Працаваў з пачатку 50-х па канец 70-х гг. у сярэдняй школе Браслава. Кіраўнік гістарычна-краязнаўчага гуртка, сябрамі якога быў створаны школьны музей. 14. Арганізатар і кіраўнік Браслаўскага антыфашысцкага падполля. 15. .Выдатны кампазітар, у 1794 г. перадаў грошы ад продажу маёнтка Дрысвяты ў фонд паўстання.



## №11




1. Пад якім годам упершыню згаданы Браслаў? 2. Год, калі ўпершыню ў пісьмовых крыніцах згадваюцца замкі Браслаў і Дрысвяты. 3. У якім годзе каралём Рэчы Паспалітай Стаіславам Аўгустам быў падпісаны прывілей Браславу на аднаўленне Магдэбургскага права? 4. У якім годзе адбылася першая канферэнцыя сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў у Браславе? 5. У якім годзе складзена адзінае вядомае апісанне Браслаўскага замка? 6. У якім годзе ў в.Дрысвяты адбыліся ўрачыстасці з нагоды пуску ГЭС "Дружба народаў"? 7. У якім годзе нарадзіўся адзін з кіраўнікоў паўстання 1794 года Т.Ваўжэцкі? 8. У якім годзе праз Браслаўшчыну праходзіў рэйд атрада паўстанцаў пад кіраўніцтвам М.К.Агінскага пад Дынабург? 9. У якім годзе ў м.Друя нарадзіўся вядомы гісторык, палеограф У.Беняшэвіч? 10. Ў якім годзе Відзаўскі раён быў далучаны да Браслаўскага? 11. Пад якім годам упершыню ўзгадваецца Опса? 12. У якім годзе ўпершыню ў Браславе праведзены фестываль народнай творчасці "Браслаўскія зарніцы"? 13. У якім годзе адбыўся першы набор у Опсаўскую мужчынскую сельскагаспадарчую школу? 14. Пад якім годам у "Хроніцы" М.Стрыйкоўскага ўпершыню ўзгадваецца Друя? 15. У якім годзе памёр Станіслаў Нарбут, вядомы лекар? 16. У якім годзе завяршылася будаўніцтва Відзаўскага касцёла Святой Троіцы?

## №12

## РАЗГАДАЙ ЧАЙНВОРД



1. Тое, што ядуць і п'юць. 2. Састаўная частка адзення, якая засцерагае ногі чалавека ад шкодных знешніх уздзеянняў. 3. Верхнее зімовае мужчынскае і жаночае адзенне з аўчын. 4. Асноўная частка вупражы, надзяваецца на шыю каня. 5. Традыцыйная рыбалоўная снасць, рухомая пастка. 6. Духавы музычны інструмент тыпу флейтавых. 7. Вывучэнне мінулага на аснове матэрыяльных астанкаў дзейнасці чалавека. 8. Гульнёвы карагод. 9. Прыстасаванне для сушкі посуду. 10. Залатая манета Рэчы Паспалітай, адпавядае 5 талерам. 11. Землеробчая прылада для пракладкі міжрадковых разор і акучвання бульбы. 12. Людаедства, паяданне людзьмі чалавечага мяса. 13. Дробная дэталь складаных, састаўных прылад працы, якія выраблялася з крэменю ў эпоху каменнага вЕка. 14. Тоўстая доўгая палка з паўкруглымі канцамі, якой таўкуць што-небудзь. 15. Вобраз у народнай дэманалогіі, у старадаўніх беларусаў увасабляў цёмныя сілы. 16. Сукупнасць рытміч і пластычных рухаў, пэўнага тэмпу і формы, якія выконваюцца ў такт музыкі. 17. Будынак прызначаны для захавання ваеннай зброі і боепрыпасаў, часткова для іх вырабу і рамонту. 18. Мужава сястра. 19. Назва народа, замацаваная старажытна-грэчаскімі гісторыкамі і географамі за плямёнамі, якія насялялі ў сярэдзіне 1 тысячагоддзя да н. э. Лясную зону Усходняй Еўропы. 20. Гліняная пасудзіна для заваркі чаю. 21. Каша з бобу ці гароху, запраўленая салам.



## №13

## РАЗГАДАЙ ГАЛАВАЛОМКІ

АБЛА 

 А



ВЯ

 НІК

АНДА 

КРУ 

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/22 sprava № 85

## №14

# РАЗГАДАЙ КРЫЖАВАНКУ



1. Мяжа паміж прасторай хаты і наваколлем. 2. Традыцыйнае выкананне нейкіх дзеянняў, танцаў. 3-гарызантальна: Прыстасаванне для агню. 3-вертыкальна: Скрыня, у якой хавалі тканіну, адзенне. 4. Традыцыйны танец. 5 .Даўняя мера масы. 6. Прылада для замыкання дзвярэй. 7. Гліняная ці драўляная пасудзіна для ежы. 8-гарызантальна: Гліняная пасудзіна для захоўвання малака. 8-вертыкальна: Тое самае што і калыска. 9. Верхнее сялянскае адзенне з белага палатна. 10. Бервяно, апілаванае або абчасанае з чатырох бакоў.

*Склаў Жэня Чапулёнак. 7 клас*



## №15

# РАЗГАДАЙ КРЫЖАВАНКУ



**Па гарызанталі**: 1. Від жылля славян у далёкай мінуўшчыне. 2.Прыродны матэрыял з якога рабілі посуд. 3. Першы полацкі князь. 4. Невялічкае возера ў сярэдзіне Браслава, берагі якога амаль поўнасцю ахоплены застройкамі.

**Па вертыкалі**: 1. Насельны пункт на паўночным захадзе Беларусі, які называюць "горадам блакітных азёраў". 2. Дачка першага полацкага князя. 3. Герой беларускіх казак, воін незвычайнай сілы, мужнасці і розуму.

*Склаў Пабяржсын Саша. 7 клас.*

# №16

## РАЗГАДАЙ КРЫЖАВАНКУ



Па гарызанталі: 1. Полацкая князёўна, дачка полацкага князя Рагвалода. 3. Прадстаўнік грамадскай думкі Беларусі, адзін з пачынальнікаў беларускай літаратуры. 5. Вялікі князь Вялікага княства Літоўскага ў 1492 – 1506 гг., кароль польскі 1501-1506 гг.

Па вертыкалі: 2. Польская пісьменніца рэалістычнага кірунку, палымяны гуманіст і дэмакрат. 3. Беларускі мысліцель гуманіст эпохі Адраджэння, рэлігійны рэфарматар. 4. Вялікі князь Вялікага княства Літоўскага. 6. Беларускі першадрукар, мысліцель-гуманіст, асветнік, вучоны, аісьменнік эпохі Адраджэння.

*Склала Гембіцкая Каця 6 клас.*



# № 17

## РАЗГАДАЙ КРЫЖАВАНКУ



1. Горад названы ў гонар князя Брачыслава Ізяслававіча. 2. Майстар, які зрабіў крыж Ефрасінні Полацкай. 3. Продкі сучасных латышоў і літоўцаў. 4. Развітанне з нябожчыкам у выглядзе ваеннай гульні ці спаборніцтва. 5. Спецыяльнае месца, куды прыносілі даніну. 6. Фіна-ўгорскія плямёны падзяляліся на ліваў і … 7. Зброя ў выглядзе доўгага дрэўка з металічным вастрыём. 8. Галоўная царква горада. 9. Асноўны від павіннасці цяглых сялян. 10. Звод законаў і абавязкаў. 11. Рынак або … 12. Умацаваны валамі і рвамі цэнтр горада. 13. Старажытнагрэчаская багіня гісторыі. 14. Агульны сход дарослых мужчын.

*Склала Шарковіч Ніна 6 клас.*

# Адказы

№ 1

*Фондасховішча*

№2

*1. Гаспадыня. 2. Абрад. 3. Столь, 4. Покуць. 5. Абярог. 6. Дамавік. 7. Абраз. 8. Радзіны.*

№3

*1.Гісторыя. 2. Замак. 3. Брод. 4. Вал. 5. Дрыва. 6. Дзвін. 7. Фібула. 8. Гаршчок. 9. Брачыслаў. 10. Летапіс.*

№4

*Андарак, каптур, чапец, порткі, вянок, кашуля, каўпак, фартух, кажух, намітка, камізэлька, хустка, скіндачка, пояс.*

№5

*Па гарызанталі: 2. Склеп. . Цеста. 5. Качка. 7. Асіна*
*Па вертыкалі: 1.Мятла. 2. Сетка. 3. Пчала. 4. Вішня.*

№6

*Па гарызанталі: 1.Недрава. 2.Войса 3. Снуды. 4. Дрывяты.*
*Па вертыкалі: 1. Несціш. 5.Дрысвяты. 6. Струста. 7.Рычы. 8. Друйка.*

№7

*Па гарызанталі: 3.Слабодка. 5.Браслаў. 6.Друя. 7.Завер'е. 8.Бяльмонты. 10. Відзы. 11. Казяны.*
*Па вертыкалі: 1.Плюсы. 2.Угар. 4.Дрысвяты. 6.Друя. 7.Зарачча. 8.Богіна. 9.Опса.*

№8

*Па гарызанталі: Зізаній. Агінскі. Полацкі. Ясінскі. Каганец. Манюшка. Альгерд*
*Па вертыкалі: Рагнеда. Базылік. Валовіч. Вітэлій. Курбскі. Скарына. Баторый.*

№9

*Па гарызанталі: 2.Неаготыка. 4.Слабодка. 7.Бяльмонты. 9.Сапегі.*
*Па вертыкалі: 1.Манівід. 3.Опса. 5.Браслаўшчына. 8.Маскавічы. 10.Іказнь.*



№10

*1. Алена. 2. Нарбут. 3. Сапега. 4. Касцюшка. 5. Брачыслаў. 6. Гваньіні. 7. Аляксандр. 8. Свідрыгайла. 9. Хедэман. 10. Дмахоўскі. 11. Ткачоў. 12. Ваўжэцкі. 13. Гарэлік. 14. Васілеўскі. 15. Агінскі.*

№11

*1). 1065 г. 2). 1402 г. 3). 1792 г. 4). 1919 г. 5). 1649 г. 6). 1953 г. 7). 1753 г. 8). 1794 г. 9). 1871 г. 10). 1960 г. 11). 1500 г. 12). 1967 г. 13). 1927 г. 14). 1386 г. 15). 1926 г. 16). 1915 г.*

№12

*1. Ежа. 2. Абутак. 3. Кажух. 4. Хамут. 5. Таптуха. 6. Акарына. 7. Археалогія. 8. Явар. 9. Рагулька. 10. Аўгустдор. 11. Ральнік. 12. Канібалізм. 13. Мікраліт. 14. Таўкач. 15. Чорт. 16. Танец.. 17Цейхгаўз. 18. Залоўка, 19. Андрафаг. 20. Імбрынак. 21. Камы.*

№13

*Аблавуха, барана, вялес, дымнік, андарак, круцёлка.*

№14

*Па дыяганалі: 1. Парог. 2. Абрад.*
*Па гарызанталі: 3. Каза. 5. Фунт. 6. Замок. . Збан. 10. Брус.*
*Па вертыкалі: 3.Куфар. 4. Антон. 7. Міска. 8. Зыбка. 9. Насоў.*

№15

*Па гарызанталі: 1. Паўзямлянка. 2. Гліна. 3. Рагвалод. 4. Навята.*
*Па вертыкалі: 1. Браслаў. 2. Рагнеда. 3. Асілак.*

№16

*Па гарызанталі: 1. Рагнеда. 3. Багушэвіч. 5. Аляксандр.*
*Па вертыкалі: 2 Ажэшка. 3. Будны. 4. Вітаўт. 6. Скарына.*

№17

*1.Браслаў. 2. Богша. 3. Балты. 4. Трызна. 5. Пагост. 6. Эсты. 7. Дзіда. 8. Сабор. 9. Аброк. 10. Закон. 11. Торг. 12. Дзядзінец. 13. Кліо. 14. Веча.*